# У гонар пані Элізы



На свяце, прысвечанаму жыццю і творчасці Элізы Ажэшкі, гродзенцы паглыбіліся ў часы, калі жыла знакамітая пісьменніца.

Эліза Ажэшка – сваеасаблівы брэнд горада. Нагадваць пра гэта гарадзенцам не забываюць супрацоўнікі інфармацыйна-адукацыйнага цэнтра ДУК «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Карскага», якія не першы год ладзяць імпрэзы, прысвечаныя знакамітай пісьменніцы. І ў гэты раз падворак Дома-музея Э.Ажэшкі ператварыўся ў месца, дзе можна было пачуць вершы, песні, патанцаваць і пагуляць. Тут сабраліся паэты, пісьменнікі, краязнаўцы, гісторыкі, прыватныя калекцыянеры, а таксама звычайныя гараджане рознага ўзросту.

Вядома, што дзверы дома пісьменніцы заўсёды былі адкрыты для творчай інтэлігенцыі. У яе часы тут працаваў так званы Гродзенскі універсітэт, наведвальнікам якога пані Эліза чытала лекцыі гісторыка-культурнай тэматыкі. Тут была школа-пансіён для дзяўчат, выхаванню якіх пісьменніца адводзіла нямала часу, а на другім паверсе адкрыты чытальныя залы.

Як і сто гадоў таму сёння домік пісьменніцы – цэнтр асветніцкай дзейнасці. На свяце чытачы бібліятэкі дэкламавалі вершы Э.Ажэшкі, а сучасныя паэты – свае у гонар суайчынніцы. Госці паглядзелі выставу старых фотаздымкаў і калекцыю рэчаў краязнаўцы Аляксандра Сявенкі, экспазіцыю літаратуры з фонду бібліятэкі, захапіліся этнічнымі спевамі і народнымі танцамі.

Асабліва цікава было дзецям. Тым больш, што Эліза Ажэшка ўсё жыццё займалася дабрачыннай дзейнасцю, у яе доме заўсёды ладзіліся пазнавальныя і забаўляльныя мерапрыемствы для дзяцей. Тут разварнулася дзіцячая пляцоўка «Бібліятэка пад адкрытым небам». У рамках праекта кожную сераду на працягу ўсяго лета дзеці могуць бавіць час за чытаннем навінак літаратуры, настольнымі і рухомымі гульнямі, запісацца ў бібліятэку і знайсці сяброў. Гэта асабліва важна у наш час, калі малых складана адарваць ад кампьютэраў.

***Вольга Кацько***

***Фота аўтара***